# Расійскія рэвалюцыі 1917 года ў лёсе Беларусі

*Матэрыялы "круглага стала", які адбыўся 19 верасня 2007 г.*
*у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі**



**Арганізатары "круглага стала"**
Рэдакцыя "Беларускага гістарычнага часопіса",
Інстытут гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі.

**Вядучыя**
*Кушнер Васіль Фёдаравіч*, галоўны рэдактар "Беларускага гістарычнага часопіса", кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
*Каваленя Аляксандр Аляксандравіч*, дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар.

**Праблемы для абмеркавання:**

1. Метадалогія і гістарыяграфія рэвалюцый 1917 года.
2. Рэвалюцыйныя падзеі 1917 года і фарміраванне беларускай дзяржаўнасці.
3. Палітычныя і сацыяльныя наступствы Кастрычніцкай рэвалюцыі.
4. Праблемы вывучэння рэвалюцыйных падзей у агульнаадукацыйных установах і ВНУ.

** Пры падрыхтоўцы публікацыі ўдзельнікамі "круглага стала" зроблены дапаўненні, уключаны таксама матэрыялы навукоўцаў, якія далі згоду ўдзельнічаць у пасяджэнні "круглага стала", але па аб'ектыўных прычынах не змаглі зрабіць гэтага.*

*Матэрыялы да друку падрыхтаваў В. Кушнер.*

бенности. Конституция 1927 года, например, закрепила государственность четырех языков. Конституции 1937 и 1978 годов интересны четкостью формулировок которые, к сожалению, оказались простыми декларациями.

Особый всплеск политической активности и движения к государственному суверенитету произошел в бывших республиках СССР в начале 1990-х годов. При этом можно вспомнить Декларацию о государственном суверенитете, придание ей статуса конституционного закона, работу над проектом новой Конституции, референдумы 1991, 1995, 1996, 2004 годов, выборы в белорусский Парламент и выборы Главы государства. Все эти процессы обеспечили легитимность политической системы суверенного белорусского государства. Многие идеи и базовые подходы в организации государственной власти, которые впервые были апробированы в нашей республике еще пять-десять лет назад, в силу их обоснованности реализуются в других государствах СНГ, например в России.

В Беларуси в целом создана современная правовая система (конечно, не без недостатков), которая обеспечивает свободное и достойное развитие личности, партнерские отношения между государством и человеком. История подтверждает — Беларусь как государство состоялась.

**В.Кушнер**. *Думаю, што ўсім нам вядомы словы, якія сталі "крылатымі": "Ёсць у рэвалюцыі пачатак". І такім пачаткам рэвалюцыйных падзей 1917 года былі рэвалюцыйныя хваляванні на мяжы XIX–XX стагоддзяў, затым рэвалюцыя 1905—1907 гадоў, перыяд узнікнення і станаўлення расійскага парламентарызму. Грунтоўным вывучэннем гэтых праблем займаецца доктар гістарычных навук, прафесар, дэкан гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка Мікалай Міхайлавіч Забаўскі. Яму слова.*



**Забаўскі Мікалай Міхайлавіч.** Мне хацелася б акцэнтаваць увагу на этнаканфесіянальнай палітыцы ўрада Расійскай імперыі ў міжрэвалюцыйны перыяд (1906—1917 гады) і яе выніках у 20-я гады XX стагоддзя. Узаемаадносіны ўлады і грамадства на сучасным этапе складана прасачыць без уліку вопыту грамадска-палітычнага жыцця краіны ў пачатку XX стагоддзя. Урадавая этнаканфесіянальная палітыка набыла дакладныя рысы з пачаткам выбарчых кампаній і дзейнасці расійскай Дзяржаўнай думы (1906—1917 гады), а таксама выбараў у земствы заходніх губерняў, або так званага "Паўночна-заходняга краю".

З мэтай не дапусціць удзелу ў рэвалюцыі беларускага і іншых народаў царскі ўрад і праваслаўная царква пры актыўнай падтрымцы праўрадавых партый і груповак сталі актыўней выкарыстоўваць ідэалогію вялікарускага нацыяналізму, сутнасць якой была акумулявана ў лозунгу "Расія для рускіх, і рускія павінны ёю кіраваць". Праваслаўныя беларусы далучаліся да правячай нацыі і прыцягваліся ў шэрагі нацыяналістычных партый.

Для забеспячэння перамогі прыхільнікаў самадзяржаўя на выбарах у III Думу ў Беларусі, акрамя саслоўна-маёмасных курый па выбарчаму закону ад 3 чэрвеня 1907 года, ствараліся і нацыянальныя курыі. Міністр унутраных спраў распарадзіўся аб раздзяленні з'ездаў землеўладальнікаў на "рускае" і "польскае" аддзяленні ў Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях. Да "рускага" аддзялення былі аднесены праваслаўныя беларусы, немцы, татары; да "польскага" — беларусы-каталікі і латышы (у Віцебскай губерні). "Рускае" насельніцтва Віленскай губерні атрымала права выбіраць свайго дэпутата ў Думу асобна ад іншага насельніцтва. Па выбарчаму закону яўрэйскае насельніцтва заходніх губерняў фактычна пазбаўлялася магчымасці сваім удзелам аказаць які-небудзь уплыў на выніку выбараў. Урад імкнуўся не дапусціць у склад дэпутатаў Думы "іншародцаў" і "іншаверцаў", зыходзячы з таго, што "Дзяржаўная дума павінна быць рускай і па духу".

Усе выбаршчыкі ў гарадах Мінскай губерні былі падзелены на тры аддзяленні. Да першага былі аднесены выбаршчыкі "рускай" нацыянальнасці (сюды далучаліся праваслаўныя беларусы, немцы, татары), да другога — "палякі" (у тым ліку беларусы-каталікі), да трэцяга — яўрэі. Кожнае з аддзяленняў выбірала аднаго прадстаўніка на губернскі сход незалежна ад агульнай колькасці выбаршчыкаў. Напрыклад, у Мінскім павеце па аднаму выбаршчыку выбіралі ад 154 рускіх, 241 паляка і 845 яўрэяў. На аддзяленні дзяліліся выбаршчыкі ў Дзвінскім, Гродзенскім, Беластоцкім, Бабруйскім і іншых паветах.

На зближэнне заможнай праслойкі беларускіх сялян з рускімі памешчыкамі на платформе рускага нацыяналізму і на аслабленне ўплыву польскіх памешчыкаў у краі быў разлічаны і законапраект аб заходнім земстве 1909 года, ініцыятарам якога быў П.А.Сталыпін. Для таго каб забяспечыць перавагу ў земстве за рускімі памешчыкамі, быў прыдуманы штучны прынцып размеркавання колькасці галосных (выбарных прадстаўнікоў) па курыях (саслоўных групах насельніцтва). Бралася сярэдняе арыфметычнае колькасці "рускага" і "польскага" насельніцтва і кошт іх нерухомай маёмасці (у працэнтах). Атрыманая лічба і складала гранічную колькасць галосных, якія выбіраліся курыямі.

Далучаючы да "рускай" курыі праваслаўных беларускіх сялян, улады забяспечвалі ў Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях яе перавагу на выбарах. У сувязі з тым, што ў Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губернях не толькі дваранства, але ў значнай ступені і сялянства былі каталіцкага веравызнання, то і па такой сістэме падліку перавагу мела б "польская" курыя. Таму ўвядзенне земства ў названых губернях не дапускалася.

Нягледзячы на тое, што па выбарчаму закону ад 3 чэрвеня 1907 года рэзка скарацілася прадстаўніцтва ад нацыянальных рэгіёнаў і ўскраін (у параўнанні з законамі ад 6 жніўня/11 снежня 1905 года), усё ж прадстаўнікі "нярускіх" народаў Расіі атрымалі, на думку прафесара Казанскага дзяржаўнага універсітэта Р.А.Ціунчука, легальную магчымасць уваходжання ў палітычную эліту імперыі.

У Думе гэтыя дэпутаты ці ўваходзілі ў агульнарасійскія палітычныя партыі, ці арганізоўвалі нацыянальна-рэгіянальныя фракцыі і групы. Дэпутаты ад 5 заходніх губерняў у Дзяржаўнай думе ўсіх чатырох скліканняў уваходзілі ў склад фракцый кадэтаў, акцябрыстаў, трудавікоў, рускай нацыянальнай фракцыі і іншых. У I Дзяржаўнай думе 15 прыхільнікаў Канстытуцыйна-каталіцкай партыі Літвы і Беларусі стварылі самастойную тэрытарыяльна-нацыянальную парламенцкую групу — "Тэрытарыяльнае кола", адным з кіраўнікоў якой стаў Раман Аляксандравіч Скірмунт. У II Дзяржаўнай думе палякі ад заходніх губерняў (12 дэпутатаў) аб'ядналіся ў "Кола польскіх дэпутатаў-канстытуцыяналістаў Літвы і Беларусі". Старшынёй быў абраны М.А.Вянслаўскі. У III і IV Дзяржаўных думах існавала польска-літоўска-беларуская група (па 7 дэпутатаў).

Польска-беларускія аўтанамісты па аграрным пытанні практычна падтрымлівалі ўрадавую праграму, але патрабавалі прадастаўлення Літве-Беларусі шырокага абласнога самакіравання з правам вырашэння аграрнага пытання. Супраць нацыянальных фракцый у III і IV Дзяржаўных думах выступала праваманархічная руская нацыянальная фракцыя.

Нельга не пагадзіцца з прафесарам Р.А.Ціунчуком, што дзейнасць нацыянальных фракцый садзейнічала фарміраванню новых нацыянальных палітычных эліт, многія дэпутаты сталі лідэрамі нацыянальных партый, а пасля 1917 года кіраўнікамі дзяржаў, нацыянальных і рэгіянальных урадаў (Циунчук Р.А. Государственная дума в этноконфессиональном дискурсе Российской империи // Политическая и социокультурная трансформация в белорусском обществе. Материалы Респ. научно-практ. конф. Мн., 2006. С. 51—53).

Практычна ўсе аўтанамісты, абраныя ад пяці заходніх губерняў у Думу, былі адукаваныя асобы і склалі ў Думе ўплывовую групу. Праўрадавая газета "Окраины России", аналізуючы выбарчую кампанію ў I Дзяржаўную думу, пісала: "Рускі народ, які жыве ў Мінскай губерні, прыняў актыўны ўдзел у абранні Р.Скірмунта, таму зараз ён можа лічыць сябе сапраўдным прадстаўніком насельніцтва" (Окраины России. 1906, 13 августа. № 24). У далейшым Р.Скірмунт неафіцыйна кантактаваў з беларускімі сацыялістамі-адраджэнцамі, падтрымліваў іх праекты ў сферы культуры, аказваў фінансавую падтрымку газеце "Наша ніва". У 1910—1911 гг. ён быў членам Дзяржаўнага савета Расійскай імперыі. Паступова Скірмунт стаў дзеячам беларускага нацыянальнага руху, з сакавіка да ліпеня 1917 г. з'яўляўся старшынёй Беларускага нацыянальнага камітэта. Дзейнасць Р.Скірмунта значна садзейнічала фарміраванню беларускай дзяржаўнасці.

Такім чынам, выбарчыя кампаніі ў расійскія Дзяржаўныя думы, дзейнасць рэгіянальных дэпутатаў адлюстроўвалі значнае ўскладненне палітычнай структуры краіны і выхад на шырокую арэну нацыянальных лідэраў, якія выступалі за дэцэнтралізацыю ўлады, развіццё мясцовага самакіравання, адстойвалі нацыянальную і канфесіянальную роўнасць. Супрацьстаянне афіцыйнай этнаканфесіянальнай урадавай палітыцы ўзрастала. Тым не менш урад і далей недаацэньваў нацыянальны фактар. Праблемы, звязаныя з нацыянальным пытаннем, не значыліся ў павестках агульных сходаў вышэйшага прадстаўнічага органа — Дзяржаўнай думы.

Да восені 1915 года значная частка беларускіх зямель апынулася пад уладай нямецкай акупацыйнай адміністрацыі. Актывізаваўся беларускі нацыянальны рух, які карыстаўся пэўнай падтрымкай германскіх улад. Пазіцыі прыхільнікаў міжнацыянальнага паразумення сярод беларусаў, літоўцаў і палякаў значна аслабелі. Паводле высноў А.Смалянчука, "дамінуючай тэндэнцыяй міжнацыянальных адносін стала абарона выключна ўласных нацыянальных інтарэсаў" (Смалянчук А. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях 1864—люты 1917 г. СПб., 2004. С. 366). Прадстаўнікі "думскіх колаў", усе плыні польскага руху ў Беларусі і Літве, якімі кіравалі Р.Дмоўскі, Ю.Пілсудскі і іх прыхільнікі, уключыліся ў барацьбу за ўтварэнне незалежнай польскай нацыянальнай дзяржавы, якая павінна была ўключаць у свой склад так званыя "ўсходнія крэсы". Аднак спадзяванні беларускіх нацыянальных лідэраў на дасягненне іх мэт не спраўдзіліся.

**В.Кушнер.** *Пры абмеркаванні любой праблемы вельмі важна ўлічваць стан яе навуковай распрацоўкі. Таму я хачу запрасіць да дыскусіі доктара гістарычных навук, загадчыка кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта Мікалая Яфімавіча Сяменчыка. Ён даследуе гісторыю палітычных партый, прафесійных і нацыянальных рухаў у час Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 года і перыяду акупацыі Беларусі ў 1918—1920 гадах. Калі ласка, Вам слова.*